Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

НАША ПРАЎДА

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрес Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Пераменна адраса 30 гр.

Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок петыту ў 1 шпальту.

№ 37 | Вільня, Серада 10-га жніўня 1927 г. | Год I

Чарод за местамі.

Побач з выбарамі ў гмінныя самаўрады адбываюцца на прасторах Заходняе Беларусі выбары ў мястовыя рады— па местах і вялікшых мястэчках.

Як ужо ведама, сялянства на выбарах у гмінах выявіла вялізарную сьвядомасьць і спажыткавала тую навуку арганізацыі сваіх сілаў дзеля дружных масавых выступленьняў, якую яно атрымала за апошні год-паўтара. Цяпер чарод прыйшоў на нашы месты й мястэчкі.

З выбараў у мястовыя самаўрады, якія ўжо адбыліся ў сталіцы краю—Вільні, ды ў радзе іншых мест, як: Ліда, Клецак, Сьвіслач і інш., — мы бачылі, што *ідэя супольнага сялянска-работніцкага фронту пад беларускім сьцягам* пусьціла глыбокія карані сярод беларускіх работніцкіх масаў па мястох. А дэманстрацыйнае выстаўленьне кандыдатуры нашага адзінага раднага ў Вільні, грам. Крука, на прэзыдэнта сталіцы Зах. Беларусі—пры варожых адносінах да яго з боку прадстаўнікоў расейцаў і літвіноў, — гэта-ж знак спогаду і пашаны да нашых імкненьняў з боку ўсяе работніцкае лявіцы агулам. І гэта найлепей паказуе, што беларуская акцыя ў местах мае *добры грунт* пад нагамі.

На гэты грунт ужо кінена добрае беларускае зерне. Яно ўзыйшло і вось дае свой плён. Плён гэты й трэба нам сабраць.

Як мы ўжо падавалі, што ў Віленскім ваяводзтве вызначаны на 4-е верасьня выбары мястовых радаў у *Глыбокім, Дзісьне, Докшыцах, Вялейцы, Радашкавічах, Падбродзьдзі і Смаргонях.* Усё гэта—месты ў значнай меры беларускія, з паважным працэнтам беларускае працоўнае бедніаты, ці-то працоўнага мяшчанства, якое жыве з цяжкае працы рук сваіх на маленечкім куску зямлі—часта адным гародзе, зарабляючы на жыцьцё падзёншчынай. І вось у іх мы і павінны зрабіць *спробу*: наскольні прабудзілася ўжо іхняя нацыянальная і сацыяльная сьвядомасьць? Мы павінны *ўсюды выступіць з сваім працоўным сьпіскам*—ці то самастойна, ці ў паразуменьні з другімі нацыянальнымі групамі: мы павінны згуртаваць і з'арганізаваць на жывым дзеле нашы сілы, а дзе народ яшчэ несьвядомы — выкарыстаць выбарную акцыю дзеля ўсьведамленьня яго. Хай—сьледам за нашай вёскай — голас беларускае бедніаты шыбане і ў месьце, каб *даць сьвядоцтва запраўднае еднасьці працоўнае вёскі і працоўнага места*!

Дык усе, хто жыў і дуж, хто ўмее і можа працаваць на грамадзкім груньце,—усе хай адгукнуцца на наш заклік і шчыра возьмуца за *арганізацыю выбарнае акцыі на мястох.* Памятайма, што прыклад удачы заражае і другіх: а перад намі-ж яшчэ выбары мястовых радаў у цэлым радзе другіх мест, апрача вышэй пераліченых,—у Горадні, у Беластоку, ды у розных іншых паветах Заходняе Беларусі, дзе самаўрадаў дагэтуль не выбіралі.

Паўтараем: беларуская вёска свой абавязак выпаўняе дужа сумленна і ўдачна. Чарод—за местамі Заходняе Беларусі!

Справа Сакко і Ванцэтті.

Губэрнатар Фулер адмовіўся памілаваць Сакко і Ванцэтті. Яны павінны быць забіты 10—11 гэтага месяца.

Хто такі Сакко і Ванцэтті, у чым іх абвінавачываюць, за што засудзілі, аб гэтым мы ўжо пісалі. Цяпер гожа толькі напомніць аб гэтым у кароткіх рысах.

Сакко і Ванцэтті — два найвыдатнейшыя правадыры работніцкага руху ў Паўночна Амэрыканскіх Штатах. У 1921 годзе паліцыя заарыштавала аднаго з таварышоў Сакко і Ванцэтті. Хочучы дабыць ад яго паказаньні, патрэбныя паліцыі дзеля сфабрыкаваньня працэсу, каб на доўгія гады ізаляваць ад работніцкіх масаў шкодных і небясьпечных для інтарэсаў амэрыканскай буржуазыі правадыроў работніцкага руху,—паліцыя страшэнным спосабам, тасуючы ўсе здабычы тэхнікі ў чыста амэрыканскім стылю, замучыла на сьмерць гэнага чалавека.

У рукі Сакко і Ванцэтті папалі непасярэднія доказы ўчынкаў паліцыі. Яны пачалі акцыю проці паліцыі.

Каб дабіцца зьдзейсьненьня сваіх папярэдніх плянаў, ды апрача таго забясьпечыцца ад раскрыцьця сваіх злачынстваў, амэрыканская паліцыя арыштоўвае ў траўні 1920 г. Сакко і Ванцэтті і абвінавачывае іх у рабунковым нападзе і забойствах, якія стала ня выходзяць з дзеннага парадку ў Амэрыцы. Ня гледзячы на тое, што Сакко і Ванцэтті ня былі апазнаны сьведкамі, ды што ў іх ня было знойдзена ніякага сьледу з зрабованых грошаў, усе ж іх суд засудзіў на сьмерць. „Доказам" віны служыць тое, што яны адмовіліся паказаць, дзе былі ў часе забойства, а таксама йшчэ і сфальшаваная экспэртыза. Судовы экспэрт устанавіў, што кулі, якія знойдзены ў целах забітых, ня вышлі з рэвальвэру Сакко; на судзе-ж справа была прадстаўлена якраз наадварот. 14 ліпня 1921 г. суд вынес сьмяротны прыгавор, бо, як сказаў адзін з судзьдзяў, „яны мусілі быць засуджаны".

Рэчазнаўца, які рабіў экспэртызу, у адказ на прыгавор злажыў публічную прысягу, што суд яго не „зразумеў" і што кулі не паходзяць з рэвальвэру Сакко. Дзякуючы гэтым абставінам справы, а такжа грознай пазыцыі амэрыканскіх рабочых, — капіталістычныя каты не пасьмелі выканаць свой прыгавар. Выкананьне адцягівалася з дня на дзень, ішлі апэляцыі, рэвізіі і касацыіі, дзесяць разоў, як паведамляюць газэты, падводзілі Сакко і Ванцэтті да электрычнага крэсла, на якім забіваюць засуджаных, і варачалі назад.

У гэтым часе выявілася, што Сакко і Ванцэтті ў часе забойства рабілі сьледзтва з прычыны сьмерці свайго таварыша. Мала таго: запраўдныя спраўцы нападу—крыміналісты прызналіся да сваей віны і далі суду, не хацеўшаму ім верыць з зразумелых прычын, нязьбітыя довады сваей віны. Аднак, і гэта не памагло.

Не памаглі і пратэсты работнікаў усяго сьвету, не памаглі пратэсты вучоных, пісьменьнікаў і палітычных дзеячоў лібэральнай буржуазіі. Губэрнатар Фулер аканчальна зацьвярджае сьмяротны прыгавар для Сакко і Ванцэтті, якія прасядзелі пад пагрозай сьмерці, гатовай зваліцца на іх кожную хвіліну, больш за 6 год і сталі за гэты час 10 разоў перад „Крэслам Сьмерці".

Зацьверджаньне 4/VIII гэтага году кары сьмерці для іх выклікала пратэст, нябывалы дагэтуль па сваей шырыні і вострасьці. Міліёны работнікаў фізычных і ўмысловых пратэстуюць на ўсім сьвеце супроць гэтага, нічым ня прыкрытага забойства работніцкіх дзеячоў клясавым судом буржуазіі. Работнікі Амэрыкі, Аргэтыны і Францыі адказываюць на гэты вызаў, кінены работніцкай клясе ўсяго сьвету, генаральнымі забастоўкамі і тэрорам для забойцаў.

Далучаючы й наш голас да агульнага пратэсту, ніжэй падаем весткі аб праявах гэтага сусьветнага пратэсту.

Падпісаньне прыгавора.

Губэрнатар Фулер падпісаў 4 жніўня прыгавор у справе Сакко і Ванцэтті. Прыгавор будзе выкананы сягоньня, 10 жніўня.

Ванцэтті аб сабе.

На судзе перад апошнім прыгаворам Ванцэтті сказаў:

„Я не жадаў бы ні гаду, ні гіене, ані найпадлейшаму ў сьвеце стварэньню, каб перацярпелі тое, што перанёс я за нязробленыя мной праступкі. Аднак, я разумею, што цярплю таксама за й віны, да якіх прызнаюся: за тое, што я рэвалюцыянэр, за тое, што я італьянец, за тое, што люблю ідэю больш, як самога сабе. Я так глыбака пераканаы ў сваей праваце, што, калі-б мяне два разы казьнілі і калі-б я два разы ажыў, я жыў бы і дзеяў-бы так, як дагэтуль".

З перадсьмертных лістоў Сакко і Ванцэтті.

З ліста Сакко:

„Пастанова губэрнатара Фулера ня дзівіць нас, бо мы ведаем, як жорстка і бязьлітасна змагаюцца капіталісты з рабочымі. Ідзем на сьмерць з пераканаьнем, што гінем, як ахвяры вялікай ідэі. Ніколі мы не сумляваліся, што губэрнатар Фулер і судзьдзі—гэта звычайныя забойцы".

Ванцэтті пісаў:

„Гінем, як ахвяры плютакратыі (грашаўладцаў) за вялікую ідэю анархізму. Няхай жыве анархізм".

Сусьветны пратэст працоўных.

Амэрыка. У Амэрыцы абвешчана аднагадзінная генаральная забастоўка ў знак пратэсту. У некаторых гарадох работнікі абвясьцілі з уласнай ініцыятывы даўжэйшыя забастоўкі пратэсту, якія растуць саматугам.

Баючыся нападаў з боку староньнікаў Сакко і Ванцэтті, усе дзяржаўныя ўстановы й біржа ў Нью-Іорку заняты паліцыяй. Міністар Келлог і іншыя высокія ўрадаўцы, палітыкі і фінансісты і іх кватэры знаходзяцца пад ахранай паліцыі. У ўрадавых колах кажуць, што прысуд, аднак, зьменены ня будзе.

Лёнданская паліцыя ахраняе амэрыканскае пасольства, прадбачучы дэманстрацыі і ўсялякія неспадзяванкі. Тое самае ў Парыжы, Штокгольме і інш.

5 жніўня каля поўначы былі кінены ў розных канцох Нью-Іорка бомбы.

Адна з бомб выбухнула на вагзале падземнай чыгункі.

Два іншыя вагзалы зьнішчаны цэлым радам бомб. Найбольш пацярпеў квартал Бродвай, дзе месьцяцца банкі, магазыны і канторы вялікіх прадпрыемстваў. Сіла ўзрываў павыкідала ўсе тавары з вакон. Паліцыя акружыла квартал. У Бальтіморы зроблены замах на дом прэзыдэнта места. Пад дом была падложана бомба. Прэзыдэнт места ня быў у хаце, была толькі сям'я. Бомба ўзарвала вэранду. Чалавечых ахвяр ня было.

Прадстаўнікі ўлады атрымовываюць лісты з пагрозамі сьмерці ў разе выкананьня прысуду.

Аргентына. Генаральная забастоўка пратэсту пашыраецца. Адбываюцца вялізарныя маніфэстацыі. Дэманстранты прымушаюць зачыняць магазыны і склады, закідаючы каменьнямі тых, хто ня слухаецца гэтых загадаў. Амэрыканскае пасольства абараняецца паліцыяй.

Англія. У суботу адбылася вялізарнейшая дэманстрацыя ў Лёндане. Партыя Працы выслала прэзыдэнту Амэрыкі Куліджу тэлеграму пратэсту.

Францыя. У Францыі адбываюцца дэманстацыі і сутычкі між работнікамі і паліцыяй. Амэрыканскае пасольства ахраняецца паліцыяй. Ідзе сьпешная падрыхтоўка дэманстрацыі на нядзелю.

На панядзелак абвешчана генаральная забастоўка.

Швэцыя. Работніцкі Камітэт Ратаваньня Сакко і Ванцэтті паслаў Кангрэсу Прафэсіянальнага Інтэрнацыяналу тэлеграму, у якой прапануе: 1) як найвастрэй пратэставаць проці забойства Сакко і Ванцэтті; 2) як доказ інтэрнацыянальнай салідарнасьці, аб'явіць інтэрнацыянальную забастоўку пратэсту; 3) пачаць байкот усіх амэрыканскіх тавараў.

Работнікі Штокгольму пастанавілі зрабіць дэманстрацыю перад амэрыканскім пасольствам. Абвешчана забастоўка.

С. С. Р. Р. У Маскве і іншых гарадох Савецкага Саюзу адбываюцца мітынгі пратэсту і дэманстрацыі.

Так выглядае пратэст працоўных і ў іншых краёх.

Аб рэзалюцыі Кангрэса Прафэсіянальнага Інтэрнацыяналу, гдзе было прадстаўлена 15 міліёнаў работнікаў з усіх старон сьвету, мы ўжо паведамлялі ў папярэднім нумары.

На шахматнай дошцы.

Палітычная ігра галоўных дзяржаваў нашага сьвету напамінае гульню ў шахматы: вось-вось здаецца, што адна старана зробіць шах і мат каралю другое, ажно нейкім неспадзяваным дробным рухам супрацiўнік ня толькі ўхіляецца ад небясьпекі, але й пераходзе ў наступленьне.

Так сталася ў апошнім часе з Англіяй і яе вонкавай палітыкай, скіраванай проці ССРР.

Здавалася, што—адначасна з удачнымі палітычнымі ходамі ў Кітаі—Англіі ўдасцца ўрэшце наладзіць даўно праектаваны супольны фронт буржуазных гаспадарстваў Эўропы проці работніцка сялянскага саюзу. Здавалася, што—шляхам націску на Нямеччыну праз Францыю, якая зрабіла (—пэўне-ж у паразуменьні з Чэмбэрленам!) рад вострых выступленьняў проці Нямеччыны (прамова Пуанкарэ!), — Англія прымусіць і немцаў пайсьці на гэны проціpадавы фронт,—і вось ужо ведамы нямецкі правы палітык граф Вэстарп стаўляў варункі, на якіх Нямеччына гатова была-бы пайсьці на проціpадавы фронт: зварот ей калёніяў, Горнае Сілезіі і гданскага „калідору"... Здавалася ўрэшце, што на канфэрэнцыі аб уладжаньні справы марскіх збраеньняў Англія аканчальна дагаворыцца з Амэрыкай і Японіяй і—на падставе гэтага дагавору — перацягне і іх на проціpадавы фронт.—Ажно неўспадзеўкі ўсе гэтыя крокі аказаліся—калі не безрэзультатнымі, дык у значнай меры недасягаючымі мэты...

„Канфэрэнцыя трох" у Жэнэве развалілася. Адначасна з гэтым амэрыканскія капіталісты пачалі рабіць захады, каб дабіцца ў ССРР для сябе пяршынства ў закупах расейскае нафты. Гэта ізноў зьменшыла рашучасьць нямецкае правіцы, якая адкрыта таргавала сваей прыязьняй з Радамі... Гэта-ж у свой чарод прымусіла Англію, — замест націсканьня на Нямеччыну праз Францыю шляхам розных пагрозаў,—вярнуцца на стары шлях задабрываньня немцаў абяцанкамі розных карысьцяў, якія ім можа даць англійскае сяброўства і паварот палітыкі проці Радаў...

Але гэта йшчэ ня ўсё: бо-ж і ССРР, пасьля няўдачы ў Кітаі, выяўляе большую актыўнасьць ізноў у Эўропе, — гэтым разам у Прыбалтыцы,—дый яшчэ ў поўнай згодзе і еднасьці... з Нямеччынай! Дарма, што Нямеччына маніцца на восеньскай сэсіі Лігі Народаў выступіць з дамаганьнем вызначэньня ей некаторых „мандатаў" на калёніі: яна сяньня поруч з Радамі распачала новую палітычную ігру над Балтыцкім морам, перахопліваючы—у паразуменьні з ССРР—ініцыятыву ад Англіі.

Дагэтуль, як ведама, ў Балтыцкіх рэспубліках — Літве, Латвіі і Эстоніі — ролю „апякуна" іграла Англія. Англія дужа добра разумее, якое значэньне мае для яе трыманьне ў сваіх руках Балтыцкага ўзьбярэжжа: гэта-ж дае ў кожын момант магчымасьць зачыніць для ССРР доступ да такіх важных для яе гандлю портаў, як Рыга і Рэваль. Датаго-ж праз Латвію і Літву Радавы саюз мае сухапутную сувязь з Нямеччынай... Англія пробавала аканчальна ўмацаваць свае ўплывы над Балтыкай—шляхам утварэньня саюзу Балтыцкіх рэспублік пад павадырствам Польшчы. Але гэта ёй не ўдалося. Наадварот: Латвія першая зрабіла гандлёвы саюз з Радамі, а цяпер — пэўне ж у паразуменьні з ССРР і Нямеччынай! — робіць рашучыя крокі, каб аб'яднаць Балтыцкія рэспублікі ў саюз бяз Польшчы, ды гэтым самым разьбіць англійскія пляны польска-літоўскага паразуменьня, дзеля якога, як ведама, за грошы Англіі ў Коўне быў зроблены фашыстаўскі пераварот. У хуткім часе латвійскі міністар заможных спраў, Цэленс, чалавек з шырокімі пагдядамі і вялікай энэргіяй, пасьля паразуменьня з сваім эстонскім калегай Акеляй, маніцца ехаць у Коўну (а мо' й абодва разам?), каб дагаварыцца з Літвой аб Балтыцкім Саюзе—на падставе радава-нямецкай орыентацыі...

Пэўне-ж, і Англія будзе з свайго боку энэргічна працаваць, каб недапусьціць да такога саюзу, які пазбавіў-бы яе ўсялякіх уплываў на Балтыку. Але пры сучасных настроях над Балтыкай (—апрача мо' аднае Літвы),—наагул прыхільных да Радаў, задача англійскае палітыкі робіцца ўсё цяжэйшай і труднейшай.

Так на палітычнай шахаўніцы зьмяняюцца шансы палітычных ігракоў... К. Ф.

Хто чытае нашу газэту і не прысылае падпіскі, той ня спрые разьвіцьцю роднай беларускай прэсы.

БРАТЫ! Прысылайце падпісную плату, а хто задоўжыўся, выраўняйце свой доўг.

Пратэст буржуазіі.

„Парі Мотіналь“ апублікавала адозву да амэрыканскіх рэдактароў і журналістаў, якія жывуць у Парыжы, заклікаючы іх да інтэрвэнцыі ў амэрыканскай прэсе ў справе Сакко і Ванцэтті. У канцы яна заяўляе: „Ня толькі аб жыцьцё двух людзей ідзе тут справа: любоў нашага народу да вашага перанясе вялікі крызіс“.

Эрыо заявіў карэспандэнту газ. „Суар“, што ён, як прадстаўнік ураду, ня можа з поўнай шчырасьцю выказаць свой пагляд, аднак, ён думае, што Сакко і Ванцэтті варты паміласаваньня.

„Парі Суар“ піша: гэтая жорсткасьць перавышае найбольш вышуканыя праступкі інквізыцыі.

Газэта „Сэколё“: нельга сабе прадставіць нешта больш жахлівае, як сямілетняя агонія (ўміраньне) Сакко і Ванцэтті.

Італьянская фашыстаўская „Трыбуна“: выкананьне прысуду будзе адным з найчарнейшых выпадкаў у гісторыі судоў.

Тое самае і нямецкая прэса.

Як бачым з гэтых вестак, навет эўрапэйская буржуазія спужалася тых насьледкаў, якія можа мець гэтае буржуазнае судовае праступленьне для буржуазных-жа судоў наагул. Дзеля таго водгуку, які знайшла сабе гэтая справа ў працоўных масах усяго сьвету, буржуазія Эўропы баіцца, што гэткім брутальным прыгаворам яна навочна пакажа працоўным масам усяго сьвету, чым зьяўляецца сучасны суд і права ў капіталістычнай дзяржаве і чаму яны служаць. У імя захаваньня фігавага лістка бестаронасьці ў барацьбе між працоўнымі і буржуазіяй, ды панадклясавай справядлівасьці і права, эўрапэйская буржуазія просіць і пагражае сваім амэрыканскім калегам, каб яны не рабілі гэткага пахабнага і цынічнага вызаву работніцкай клясе і ўсім працоўным сьвету. Баючыся грамадзкай апініі працоўных, яна, далучаючыся да пратэстаў працоўных, мае на мэце выгарадзіць, засланіць клясавую сутнасьць сваіх радзімых судоў і права перад сваімі маласьвядомымі працоўнымі масамі, ды аслабіць тое ўражаньне і тыя вывады, якія мусіць зрабіць самы несьвядомы працаўнік у разе, калі пратэсты, дэманстрацыі, забастоўкі працоўных усяго сьвету не акажуць уплыву на зарваўшыхся ў сваім клясавым засьляпленьні і ненавісьці амэрыканскіх капіталістаў. Пратэстуючы супроць цынічнага клясавага судовага забойства нябясьпечных для буржуазіі павадыроў працоўных, яна хоча ратаваць у вачох масаў уласную павагу, ды павагу свайго суда і права.

Канфлікт між Амэрыкай і Англіяй.

Англійская прэса востра атакуе Амэрыканскія Штаты за іх няўступлівае становішча на канфэрэнцыі ў справе „разбраеньня“, якая толькі-што разьехалася ні з чым—быццам з прычыны гэтага апору Амэрыкі. — З свайго боку амэрыканская публічная апінія—з большай слушнасьцяй гнеўна вінаваціць англійскіх палітыкаў за пагвалчэньне вашынгтонскай умовы аб роўнасьці марскіх сілаў Амэрыкі і Англіі, ды за жаданьне захаваць для Англіі „бязумоўнае панаваньне на марскіх шляхох“. Англійцы страшэнна залавалі на Амэрыку, чаму гэта яна „ня хоча зразумець асаблівай будовы англійскай сусьветнай Імпэрыі, валаданьні якое раскінены па ўсяму сьвету, ды якая патрабуе — дзеля іх лучнасьці й абароны—трымаць такі флёт, як ніводная іншая дзяржава“. Амэрыка ж можа зусім не баяцца нападу з мора, дык і вялікага флёту не патрабуе. — Амэрыканская апінія на гэта адказывае, што тое, чаго патрабуе Амэрыка, а чаго не патрабуе, гэта ўжо справа самой Амэрыкі; а Англія хай толькі выканае вашынгтонскую ўмову аб роўнасьці флётаў абедзьвюх дзяржаў...

Як ведама, канфэрэнцыя сарвана аканчальна, дэлегаты ўжо разьехаліся, справа паразуменьня аб „разбраеньні“, ці лепш: аб роўным збраеньні на моры — адложана на далёкі тэрмін. У выніку гэтага ізноў пачнецца канкурэнцыя Амэрыкі і Англіі ў будове новых ваенных караблёў, дый наагул—завастрэньне канкурэнцыі між гэтымі дзяржавамі ў-ва ўсіх галінах на сусьветнай арэне. Ад гэтай канкурэнцыі, як ведама, Англія асабліва ўхілялася ў апошнія часы пасьля вайны, уступаючы Амэрыцы на кожным кроку. Чаму? А таму, што Англія была страшэнна падарвана вайной, а ад разбагацеўшай на вайне Амэрыкі спадзявалася фінансавай ды іншай дапамогі дзеля адбудовы сваей даваеннай сілы. І Амэрыка запраўды-ж адратавала англійскую валюту ў першую чаргу, вярнуўшы ёй яе „залаты парытэт“ (даваенны ровень у золаце). Згода Англіі—на канфэрэнцыі ў Вашынгтоне — на роўнасьць марскіх сілаў з Амэрыкай была пэўным тактычным ходам Англіі ў імя гэтых мэтаў. Але цяпер відаць, што англійскія шляхотныя дзяржаўнікі зусім ня зьбіраліся спаўняць свайго вашынгтонскага прырачэньня... Дык амэрыканская прэса ядавіта радзіць свайму ураду—зрабіць з гэткага паступаньня Англіі „ўсе належныя вывады“, ці—папросту—абвясьціць фінансавую вайну Англіі і гэтак зламаць яе валюту, якая ўсьцяж трымаецца на залатым роўні ў значнай меры дзякуючы падтрыманьню Амэрыкі.

З гэтага відаць, што абедзьве англа-саксонскія дзяржавы, якія толькі што—праз вусны сваіх адказных дзяржаўнікаў—бажыліся ў немагчымасьці ніколі ў сьвеце ніякай вайны між абыдвума брацкімі народамі, цяпер гэтак заеліся, што гэтая вайна між „братамі“, гатовымі за панаваньне на сьвеце перагрызьці адзін аднаму горла, зусім не немагчыма...

Як-бы там ні было ў далейшым, але цяпер завастрэньне канкурэнцыі між Амэрыкай і Англіяй ужо стварае надзвычай важнае зьявішча ў сусьветнай палітыцы, якое зараз жа мае адбіцца на ўсіх яе „фронтах“—палітычным, гаспадарчым, ваенным і інш...

Можа ня будзе недарэчным зьвязаць з гэтым агульным зьявішчам і весткі аб праекце амэрыканскага ўраду зьвярнуцца з адозвай да... „расейскага народу“. Амэрыканская прэса ўжо паведаміла аб агульным зьмесьце гэтай „адозвы“, якая, можна сказаць, б'е можа меньш па радавым ўрадзе, чым па... панох Чэмбэрленах, каторыя за ўсялякую цану стараліся ўцягнуць Амэрыку да „процірадавага фронту“... Адозва мае заявіць выразна, што амэрыканскі ўрад, які й далей ня зьбіраецца прызнаваць радавага ўраду, аднак-жа рашуча абвяшчае, што „ня будзе прымаць учасьця ні ў якой камбінацыі (дадай: паноў Чэмбэрленаў!), скіраванай проці цэласьці і адзінства тэрыторыі Расейскай Дзяржавы“... І хаця ў далейшым адозва, як інфармуе прэса, кажа, што ўсе культурныя народы жадаюць павароту ў сваю кампанію расейскага народу, але гэтаму на перашкодзе стаіць камуністычны лад і радавая ўлада ў СССР, што толькі новая ўсенародная, нацыянальная (чытай: буржуазная) ўлада, як „законная“, адратуе Расею, — але ясна, што гэта ўсё — паўтарэньне старога... Але вось новае „сьвежае“, зьвязанае з апошнімі падзеямі, дый, пэўна-ж—выкліканае толькі-што адбытым зрывам паразуменьня з Англіяй,—зьяўляецца якраз—рашучая адмова супрацоўніцтва з Англіяй — у ваенна гаспадарчым „акружэньні“ ды байкоце Радаў, у-ва ўсіх англійскіх авантурах, як „аддзяленьне Украіны“, і таму падобных...

У гэтым—асаблівая цікаўнасьць і важнасьць адозвы.

Трэба спадзявацца, што сьледам за гэтым пойдуць і іншыя надобныя факты, як вынікі адбытага канфлікту і разрыву „суцольнага англа-саксонскага фронту“, які Англія хацела выкарыстаць толькі для сябе, не даючы Амэрыцы ўзамену—нічога!...

„Разбраеньне“ у 13 угодкі сусьветнай вайны.

З прычыны трынадцатых угодкаў абвяшчэньня вайны „Дэлі Гэральд“ зьмяшчае артыкул, у якім прыпамінае, што ў выніку сусьветнай вайны больш за 7 мільёнаў людзей было забіта і больш за 13 мільёнаў ранена, і гэта — у імя інтарэсаў розных групаў паноў капіталістаў, і інтарэсаў, прыкрытых высокімі фразамі аб цывілізацыі і вызваленьні народаў. Далей у артыкуле пададзены цыфры, якія паказываюць „міралюбства“ імпэрыялістаў пасьля вайны, якая называлася імі „Астатняй“.

Вось яны — гэтыя цыфры:

Англія выдае што-год 124,648,000 фунтаў штэрлінгаў, або 5 мільярдаў 424 мільёны польскіх злотых; Амэрыка — 109,010,000 фунтаў, або 4 мільярды 742 міліён. зл: Японія 161,540,000 фунтаў, або 7 мільярдаў 27 мільёнаў зл.; Францыя 45 мільёнаў фунтаў, або 1 мільярд 957½ мільёнаў зл., Італія блізка гэтага-ж і гэтак далей без канца.

Гэтакі цяжар збраеньня павінны нясьці працоўныя пасьля так гучна называнае буржуазіяй „апошняе вайны за вызваленьня нацыяў“. Крывёй і потам працоўных гатуюцца новыя сродкі дзеля іх узаемнага зьнішчэньня — у імя інтарэсаў „радзімых капіталістаў, — дзеля яшчэ страшнейшага, яшчэ вялікшага зьнішчэньня, чым тое, якое мы нядаўна перажылі. Гатуецца новая сусьветная бойня. Яна не за гарамі, калі толькі працоўныя масы, замест узаемнага зьнішчэньня, ня ўзыйдуць на шлях згоды й братняга супрацоўніцтва народаў.

Чычэрын аб адносінах з Англіяй.

ТАСС паведамляе з Масквы:

Камісар заменжных спраў СССР Чычэрын у гутарцы з прадстаўнікамі прэсы заявіў:

— Вас цікавіць справа, што азначае шум, узьняты ў заграгічных газэтах, у сувязі з англійскімі прапазіцыямі, быццам зробленымі ўраду СССР — аб узнаўленьні дыпляматычных адносін між СССР і Англіяй? Радавы ўрад ніякіх прапазіцыяў не атрымаў. Што датычыць прамовы Чэмбэрлена ў англійскім парляманьце 28 ліпня, то перадусім яна мае характар звычайных нападаў на ўрад СССР, каб гэткім чынам укрыць перад грамадзкай апініяй Англіі недапушчальныя крокі, якія рабіў і робіць кансэрватыўны англійскі ўрад у адносінах да СССР, як напрыклад: напад на пасольства ў Пэкіне, напад на „Аркос“, гісторыя з фальшывым дакумэнтам, зрыў дыпляматычных зносінаў і г. д. Апрача таго прамова Чэмбэрлена мае на мэце ашукаць англійскую грамадзкую апінію і гандлёвыя колы ў справе гандлю з СССР. Пан Чэмбэрлен думае, што ў варунках зрыву дыпляматычных зносінаў, ды поўнай няпэўнасьці радавае маемасьці тарговыя зносіны могуць вясьціся па-даўнейшаму.

Гэта, далікатна кажучы, абмылковае становішча. Ня трэба забывацца, што зрыў дыпляматычных зносінаў і тарговага дагавору былі зроблены з ініцыятывы англійскага ўраду.

Я павінен абвясьціць, што дагэтуль мы ніякіх урадавых ні паўурадовых прапазіцыяў у справе ўзнаўленьня зносін з англійскім урадам не атрымалі. Разумеецца, што, калі б англійскі ўрад зрабіў фактычныя прапазіцыі аб узнаўленьні зносін, дык урад СССР, гатоў у кожнай хвіліне прыступіць да перагавораў, пры чым будзе дамагацца зарукі, што падобных рэчаў, як напад на „Аркос“ і інш., ня будзе. Радавы ўрад гатоў адказаць на шчыры крок, які-бы давёў да міру, бо справа міру ляжыць таксама ў інтарэсе шырокіх працоўных мас СССР, як і Англіі.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

У справе склікаьня Сойму.

Як ведама, на паседжаньні 2 га жніўня прадстаўнікі польскіх партыяў Сойму пастанавілі падпісаць заяву да п. Прэзыдэнта аб скліканьні Сойму — на пачатак верасьня. На гэтую нараду старшынёй Сойму ня былі запрошаны клюбы нацыянальных меншасьцяў. Але на тым-жа паседжаньні польскіх клюбаў было пастаноўлена — па прапазыцыі пэпэсаў—запрасіць прадстаўнікоў меншасьцяў на новае такое-ж паседжаньне—у пачатку верасьня, перад зборам Сойму.

Старшыня Сойму зараз-жа зьвярнуўся з гэткім запрошаньнем да Жыдоўскага Клюбу, вытлумачыўшы яго старшыні, п. Гартгляссу, што не запрасіў прадстаўнікоў меншасьцяў на першую нараду дзеля таго, што ўсе яны выразілі сваё здаваленьне з прычыны перарыву сэсіі Сойму, не зьвярнуўшы пры гэтым увагі на нарушэньне ўрадам прынцыпу дэмакратыі...

П. Гартгляс адказаў, што Жыдоўскі Клюб выразіў здаваленьне дзеля таго, што роспуск Сойму ўрадам перашкодзіў Сойму прыняць праекты, скіраваныя проці правоў і інтарэсаў меншасьцяў; дык Жыдоўскі Клюб зусім не абразіўся на Старшыню Сойму за тое, што той не запрасіў яго прадстаўнікаў на нараду...

Радава-польскія адносіны.

У Варшаву раптам вярнуўся польскі пасол пры радавым урадзе пан Патэк, які толькі-што быў паехаўшы ў Маскву. Але, як цьвердзіць прэса, вярнуўся п. пасол дзеля таго, што абгаварыў ужо ў Маскве памысна ўсе справы, зьвязаныя з ліквідацыяй забойства п. Войкова, ды з падрыхтаваньнем гаранцыйнага і гандлёвага трактатаў. Цяпер п. Патэк, як і кандыдат на радавага пасла ў Варшаве Стомоняков, які вёў з ім перагаворы ў Маскве, абодва, пасьля гэтай працы, атрымалі одпуск на некалькі тыдняў. Пасьля павароту з одпуску абодва ізноў пачнуць перагаворы ў справе заключэньня абодвух трактатаў.

Газэты пішуць, што ўступное паразуменьне настолькі папраўіла адносіны між абодвума ўрадамі, што магчыма ў бліжэй-

Ал. Васіленя.

Практычныя парады

да пастаноукі спэктаклю на вёсцы.

Дэкарацыя.

Дэкарацыя для п'есы, якая ставіцца, павінна быць як найлепш суадказнаю. Калі, напрыклад, на сцэне павінна быць нутранасьць сялянскае хаты, дык трэба даглядзець, каб усё чыста было так, як у натуральнай сялянскай хаце, г. зн. сьцены, печ, стол лавы і г. д. усе драбязгі былі такія, так расстаўлены і разложаны, — як у хаце. Калі-ж трэба прадставіць пакоік інтэлігента, або лес, сад, вуліцу, падворак і г. д., дык старацца, як мага, каб усё гэта выглядала, так, як яно ёсьць запраўды ў жыцьці. Трэба даць глядзельніку натуральны і суадказны вымаганьням п'есы вобраз таго месца, дзе праходзіць дзеяньне. Вельмі няпрыемнае ўражаньне робяць такія, напрыклад, выпадкі: на сцэне павінен быць лес, дзеючая асоба гаворыць пра гэты лес, паказвае на яго рукою, а на сцэне замест лесу—стаяць два — тры дрэўцы; ну, і ведамая рэч, што ўсякае ўражаньне ў глядзельнікаў прападае, бо выходзіць ненатуральна.

Калі ў п'есе выводзіцца здарэньне мінулага жыцьця, дык апрача ўсяго ўспомненага, пры наладжаньні дэкарацыі трэба моцна застасавацца да тэй эпохі, у якой дзеялася здарэньне і які тагачасны характар насілі, напрыклад, памяшчэньне, вуліца, падворак і г. д.

Трэба таксама зварачваць увагу і на тое, якая абстаноўка хаты, пакою, падворка, і г. д., бедная ці багатая (напрыклад: розьніца між хатаю багатага селяніна і беднага). Калі п'еса ставіцца паважная і сур'ёзная (драма, трагэдыя), дык уся дэкарацыя павінна быць зладжана так, каб мела суадказны характар і наадварот, — калі п'еса зьместу лёгкага (камэдыя, фарс), дык дэкарацыі трэба даць таксама суадказны выгляд.

Таму наагул для вясковага спэктаклю трэба падбіраць для пастаноўкі такую п'есу, для якой патрэбную дэкарацыю можна лёгка самому на сцэне зрабіць, або калі такая дэкарацыя ёсьць у распараджэньні аматараў, але-ж, каб яна як найбольш суадказвала вымаганьням п'есы.

Вопратка.

Вопратка дзеючых асобаў, яшчэ больш, як дэкарацыя, павінна суадказваць характару п'есы. Калі п'еса з сялянскага жыцьця, дык трэба, апранваючы асоб ў сялянскія вопраткі, моцна прыдзержвацца, каб усе падрабязнасьці і асаблівасьці гэтае вопраткі былі захованы, як найяскравей. Калі п'еса з жыцьця мястовага, дык ізноў суадказная вопратка мусіць адразу паказаць глядзельніку, кім больш-менш зьяўляецца дзеючая асоба.

Трэба добра помніць і аб тым, што, напрыклад, вопратка інтэлігента вясковага і інтэлігента мястовага мае сваю асаблівую, часамі вельмі няпрыкметную, розьніцу. Апрача таго, вопратку трэба дастасаваць да характару ролі дзеючай асобы і яго жыцьця, калі, напрыклад, роля асобы сур'ёзная і паважная, дык вопратка мусіць адбіваць у сабе характар і склад жыцьця гэнай асобы і, наадварот, у ролях камічных вопратку трэба даць камічную, сьмешную, — але-ж ізноў, каб не загублены быў стыль.

Дзеючыя асобы п'есы з мінуўшчыны павінны быць апрануты ў вопраткі, адказваючыя эпосе дзеяньня здарэньня.

Наагул, на адзеньне дзеючых асобаў трэба зьвяртаць больш значную ўвагу, чым на дэкарацыю, бо вопратка часьцьцю адбівае і асабісты характар паасобку кожнае асобы і павінна даць глядзельніку прадстаўленьне аб асобах, паміма таго, што яны будуць гаварыць і рабіць на сцэне.

Грым.

Ня гледзячы на тое, што на вёсцы аматары часта зусім ня маюць прыладаў для грыму і карыстаюцца самымі прымітыўнымі спосабамі, усё-ж такі вельмі і вельмі вялікую ўвагу трэба зьвяртаць на загрыміраваньне дзеючых асобаў. Перш-на-перш кожнага, хто толькі выходзіць на сцэну, хаця гэта будзе і статыст, абавязкава трэба грыміраваць, дзеля таго, што незагрыміраваны твар з сцэны будзе выглядаць якімсьці блядым, бескалёрным і ня мае ніякага выразу. Класьці грым на твар трэба разьмерна, каб не выглядала вельмі нашмараваным і ненатуральным, дзеля гэтага, калі няма добрага грыму, дык толькі трэба класьці самыя характэрныя рысы і цені. Грым кладзецца выразьней ці лягчэй у залежнасьці ад таго, які будзе сьвет на сцэне: — калі сьвет слабы (звычайныя газавыя лямпы), дык грым трэба даць глыбокі і рэзкі і наадварот—пры яркім сьвеце (электрычным) — грым лёгкі мяккі і далікатны. Перад грыміраваньнем трэба твар чуць, зьлёгка, пакрыць вазалінаю, або якою іншаю тлустасьцю, тады за яго лепш бяруцца хварбы і пасьля грым хутчэй і лягчэй здымаецца.

Для лепшай арыентацыі прывяду колькі агульных практычных парадаў прасьцейшага грыму:

1) **Грым маладой і прыгожай асобы.** Твар, шыя і вушы пакрываюцца белай чуць ружовую хварбаю; каля вачоў падхварбоўваецца трошкі цёмна-сінім; ніжнія і верхнія векі каля самага краю тонеька абводзяцца чорным; бровы зацямняюцца, што прыдаець ім прыгожы выгляд; з бакоў нос чуць-чуць адцяняецца цёмным, а пасярэдзіне носа — белым; на шчокі кладзецца малочна-чыроная хварба, а таксама чуць, зьлёгка, на падбародак і верхнія часьці вушаў; вусны чырвоняцца. Усё гэта зьлёгка пакрываецца пудраю і потым пудра зьдзьмухваецца.

2) **Грым асобы ў сярэднім веку.** Твар пакрываецца ружова-цёмна-жоўтым, каля вачэй пахварбоўваецца сіня-карычневым, векі падводзяцца чорна-карычневым, нос з бакоў адцяняецца цёмным, шчокі і вушы — чуць-чуць чырвоным; кругом вачэй, каля носа, вуснаў і падбародка кладуцца лёгкія цёмна-карычневыя карпацінкі.

3) **Грым старой асобы.** Твар пакрываецца ружова карычневым, на носе трохі цямней, каля вачэй — карычневым, векі падводзяцца цёмна-чырвона карычневым; нос з бакоў, запаласьці шчок адцяняецца цёмна-карычневым і на вусны зьлёгка кладзецца чырвона-карычневай хварбы; на лобе, між бровоў, каля вачэй, носа, вуснаў і падбародку кладуцца глыбокія карбаціны цемна-карычневым і адцяняюцца з бакоў ружова-белымі палоскамі.

4) **Грым хворага.** Твар пакрываецца ў залежнасьці ад веку і стану хваробы: а) бела-жоўтым, б) брудна-бела-жоўтым, в) брудна-жоўта-зялёным; вочы моцна падводзяцца цёмна-сінім, векі чорным; нос адцяняецца цёмным і пасярэдзіне белым, каб выглядаў завостраным; потым на шчоках і з бакоў лобу вышэй скіўцаў і пад барадою між пашчэмкаў — робяцца цёмныя запаласьці; каля носу і між бровоў праводзяцца глыбокія маршчыны, вусны чырвона-сінія.

У мужчынскіх ролях дзеючых асобаў, у меру патрэбы прыходзіцца ўжываць парыкі, накладныя барады і вусы. Ведамая рэч, што зрабіць вясковым аматарам бараду і вусы так, каб было зусім натуральна — вельмі трудна і ў большых выпадках немагчыма, так што найлепей старацца памагчымасьці ўнікаць гэтага. Апрача таго, барада і вусы

шым часе назначэньне ў Варшаву новага пасла СССР.

Назначэньне радавага пасла.

Як пішуць газэты, назначэньне радавага пасла пры польскім урадзе — справа найбліжэйшых дзён.

Камісарыят замежных спраў маніцца назначыць за наступніка Войкова — Стомонякова або Аралава. Менш праўдападобнай, як кажа польская прэса, зьяўляецца кандыдатура Лёрэнца.

Высяленьне з Польшчы расейскіх манархістаў.

Відаць, у сувязі з перагаворамі з урадам СССР, польскі ўрад, як інфармуе „Газ. Варш. Пор.“, пастанавіў высяліць з межаў Польшчы шасьцёх расейскіх эмігрантаў. Чуткі аб масавым выдаленьні расейскіх манархістаў—беспадстаўныя.

Паветраныя манэўры каля Лодзі.

У палове бягучага месяца адбудуцца паветраныя манэўры каля Лодзі з учасьцем пяхоты і артылерыі. Між іншым, у прыграме манэўраў прадбачана паветраная атака на Лодзь.

29 га ліпня прыбылі ў Лодзь 3 эскадры аэрапланаў з Пазнаня. Манэўры будуць трываць да 10-га верасьня.

„Мілітарызацыя“ Прэзыдыуму Рады Міністраў.

Бясслаўнай памяці „тварэц прэсавых дэкрэтаў“ п. Гжыбовскі, які дагэтуль быў шэфам габінэту прэм'ера, мае падтрымліваць можа з вялікшым пасьпехам годнасьць Польскай Дзяржавы ў Празе, як польскі пасол. А на яго мейсца, як пішуць газэты, мае быць назначаны — ну, ведама-ж — паўкоўнік генаральнага штабу нейкі п. Перацкі.

На мейсца сэкрэтара Рады ж Прэзыдыуму мае быць назначаны, замест звольненага ўжо нязадольнага „цывіля“ — пэўна-ж, што здольны, паручнік польскай арміі, нейкі пан Козьмінські.

Рэакцыя трыумфуе!

Рэакцыйная прэса трыумфуе з прычыны назначэньня на становішча львоўскага ваяводы абшарніка-рэакцыянера графа Дунін-Борковскага. У гэтым назначэньні рэакцыйныя газэты бачаць доказ узмацненьня рэакцыйнага курсу ўраду.

Процi „працэнтнае нормы“.

Камісія рэчазнаўцаў у справах меншасьцяў парадзіла ўраду скасаваць усялякія абмяжаваньні для меншасьцяў пры прыйме студэнтаў у вышэйшыя школы. На падставе гэтай рады міністар асьветы разаслаў да ўсіх дырэктараў гэтых школаў цыркуляр, якім загадаў, каб, прымаючы ў гэтым годзе студэнтаў, не рабілі розьніцы дзеля кандыдатаў розных нацыянальнасьцяў ці рэлігіяў.

Заграніцай.

Справа нямецкіх каляніяльных мандатаў.

Як паведамляе ПАТ, на паседжаньні бэльгійскай рады міністраў разглядалася справа нямецкіх прэтэнсіяў адносна калёніяў. Як ведама, немцы зьбіраюцца паставіць на парадак дня чарговай сэсіі Рады Лігі Народаў пытаньне аб звароце ім старых або наданьні новых калёніяў. Бэльгійская прэса піша, што дзеля таго, што Англія і Францыя гатовы прыняць нямецкія дамаганьні, бэльгійскі ўрад думае падтрымаць пазыцыю вялікіх дзяржаў.

Вынікі Жэнэўскай канфэрэнцыі.

Як паведамляе „Бэрлінэр Тагеблят“, марскі міністар Амэрыкі, Вільбур будзе мець у найбліжэйшым часе цэлы рад канфэрэнцыяў з чыноўнікамі свайго міністэрства, каб з увагі на жэнэўскі крах выпрацаваць новую праграму збраеньняў для чарговай сэсіі амэрыканскага кангрэсу.

Радавая прэса аб жэнэўскім краху.

„Известия“, сцьвярджаючы крах Жэнэўскай канфэрэнцыі, адзначаюць, што разам з разваламі канфэрэнцыі ілюзыі, пашыраныя сацыял-дэмакратамі (тое самае, што ППС-ы) сярод масаў аб магчымасьці паразуменьня між імпэрыялістычнымі дзяржавамі, атрымалі проста забойчы ўдар.

„Правда“ кажа: „жэнэўскі крах затрудняе паразуменьне між англійскімі і амэрыканскімі імпэрыялістамі, аднак, мы не павінны ўсыпляць сваёй ўвагі. Хаця гэтыя драпежнікі змагаюцца між сабой, усё-ж такі яны могуць напасьці на нашую старонку, як на базу (аснову) сусьветнага пралетарскага і нацыянальнага вызваленьня. Гэтага мы ня можам забываць ані на адзін мамэнт. Прысьпешаны тэмп збраеньняў стварае надзвычайнае напружаньне міжнародавых адносін, і гэтая атмасфэра ўзьвялічывае небясьпеку правакацыі супраць нас. Мы мусім таксама ўзьвялічыць нашу гатоўнасьць да абароны“.

Нялюдзкі спосаб змаганьня.

Як падае польская прэса, у Маскве ў санаторыі „Московский Пролетарий“ нейкія нявыкрытыя нягоднікі надумаліся атруціць 190 хворых, якія тамака лечацца. Паводле газэтных вестак, зроблена гэта „белымі“ контррэвалюцыянерамі, каб адным махам зьнішчыць 190 камуністаў (бадай выключна работнікаў). Злачынства ўдалося толькі часткова: памерла шэсьць хворых, рэшта жыве.

Пэпэсы у апазіцыі.

Цікаўная пагроза.

Орган пілсудчыкаў „Эпоха“ (выдаваная, як цьвердзяць газэты, за грошы Польскага Скарбу) надрукаваў — з прычыны ўгодкаў „6-га жніўня“ — адозву Варшаўскага Выканаўчага Камітэту „Огніска Пілсудчыкув“, вельмі цікаўнага для нашых часоў зьместу.

У гэтай адозьве паны варшаўскія пілсудчыкі, паміж іншым, пішуць, што яны, пратэстуючы проці эндэцкай „манаполіі на патрыятызм ды польскасьць“, адначасна — „папераджаюць усіх тых, хто хацеў-бы процістаўіцца ідэі Камэнданта, што яны гэтую ідэю гатовы бараніць з усей зацятасьцяй („з цалон зацентосьцён“) ды з поўным ахвяраваньнем сябе („з цалым запарцем сен себе“), — як гэта яны даказалі ў гады вайны дый у барацьбе „за гонар польскага жаўнера“ (чытай: у часе „маёвых падзей“ у Варшаве....).

Інакш кажучы, раздавіўшы адну „манаполію на патрыятызм ды польскасьць“ — эндэцкую, паны пілсудчыкі выстаўляюць новую — сваю ўласную, дый яшчэ з яўнай пагрозай фашыстаўскай расправы з яе праціўнікамі, — пагрозай, на якую, здавалася-бы, знайшліся адпаведныя „артыкулы“ ў Карным Кодэксе Польскай Рэспублікі.

Бедны „згвалчаны да апазіцыі“ пэпэсаўскі „Роботнік“, прачытаўшы гэтую „адозву“, не на жарты перастрашыўся. „Што гэта значыць, паночкі: „процістаўіцца ідэі Камэнданта“? — пытаецца ён, весь зьбялелы ад страху“... А ці апазіцыя проці ўраду маршалка Пілсудскага ёсьць, мае паночкі, „процістаўленьнем ідэі Камэнданта“?...

Трэба думаць, што на гэтыя слушныя запытаньні павадыры варшаўскага „Огніска Пілсудчыкаў“ дадуць яснае высьвятленьне, так патрэбнае дзеля спакою пэпэсаў. Але, нажаль, будзе яно для іх ня вельмі супакойваючым...

У кожным разе, гэтая адозва зьяўляецца цікаўнай адзнакай „дыфэрэнцыяцыі“ ў шырокім лагеры, ці „огніску“ пілсудчыкаў, у склад якіх яшчэ зусім нядаўна ўваходзілі гуртом—амаль-што бяз вынятку — усе пэпэсы. У выніку гэтага выразна, здаецца, падзяліліся і неяк сумбурна памяшаныя дагэтуль учасьнікі т. з. „маёвага перавароту“: тыя, хто ў траўні леташняга году бароліся „за гонар польскага жаўнера“ (чытай: афіцэра), рашуча адмяжаваліся дый навет пагражаюць расправай тым, хто тады заклікаў — дзеля здабыцьця для першых паўнаты ўлады ў краі—работніцкія масы.

Вось у гэтым усё больш завастраючымся па сваей варожасьці падзеле быццам аднолітага дагэтуль абозу пілсудчыкаў, — падзеле, ад якога аж крывёй ды цыганскім потам абліваюцца сэрцы паноў пэпэсаў, але да якога змушаюць апошнія работніцкія масы,—усё важнае значэньне адозвы...

Польская прэса—аб „пэпэсах у апазіцыі“.

Уся польская прэса папросту ня верыць у шчырасьць пэпэсаўскай апазіцыі ў адносінах да ўраду марш. Пілсудскага.

„Кур. Поран.“ заяўляе, што спрытныя пэпэсы перайшлі ў апазіцыю—з пагляду на набліжаючыяся выбары, каб ня лучыць свабей надмочанай фірмы з яшчэ больш скампрамітаванай у краі фірмай ураду.

„Кур. Польскі“, з свайго боку, ня верыць у шчырую пэпэсаўскую апазіцыю, бо ў ППС ёсьць вялікая лічба пілсудчыкаў, дзеля гэтага між партыяй і Пілсудскім ніколі ня дойдзе да шчырай адкрытай барацьбы.

Пэпэсы і марш. Пілсудскі.

З якім „болем у сэрцы“ прынялі пэпэсы сваю рэзалюцыю аб пераходзе ў апазыцыю да ўраду марш. Пілсудскага, паказуе факт, апісаны варшаўскім карэспандэнтам радавае газэт „Известия“ Братіным. Пераказуем гэтае апісаньне паводле „Słowa“.

У часе завастрэньня канфлікту між Соймам і марш. Пілсудскім „спакойны і зраўнаважаны філістэр“, „вораг рашучых мераў“ пасол Недзялковскі па даручэньню павароў П. П. С. папрасіў марш. Пілсудскага аб прыйме яго дзеля палітычнае гутаркі. Пілсудскі прыняў яго. У часе гэтае гутаркі Недзялковскі плакаў, маліў і ўканцы — страшна сказаць!—амаль-што не пагражаў „камэнданту“. Недзялковскі паказваў марш. Пілсудскаму на блізкую небясьпеку эканамічнага крызісу, на грознае становішча працоўных масаў і ўрэшце на страшэнную двузначнасьць палажэньня польскіх „сацыялістаў“, якія кідаюцца паміж адкрыта-капіталістычнай палітыкай ураду і ўсё ўзрастаючымі дамаганьнямі шырокіх масаў работнікаў.

Прэм'ер паступіў з лідэрам П. П. С., як з хлапчуком — „мальчишкой“. Выслухаўшы ўсе вывады п. Недзялковскага, парадзіў яму... „пайсьці спаць“!

Нас ня цікавіць у-ва ўсей гэтай справе ані прызнаньне пэпэсамі свайго палітычнага банкруцтва, бо яно ведама ўсім, ані тая форма, якое ўжыў марш. Пілсудскі ў гутарцы з павадыром гэнае згодніцкае партыі,—а нешта іншае. Іменна тое, што пазыцыя марш. Пілсудскага ў адносінах да працоўных масаў, ад імя якіх зварачаўся да яго п. Недзялковскі, аканчальна выясьнілася, не пакідаючы надалей месца для якіх-колечы лятуценьняў і спадзяваньняў...

Затое ўрад, відаць, „ną otarcie łez“ (каб абцерці сьлёзы) — даў галоўнаму органу пэпэсаў „Роботніку“ вялізарныя абвесткі аб розных урадавых прадпрыемствах, і без таго ўсім добра ведамых,—як: „Bank Rolny“, „Państwowa Kasa Oszczędności“, дзяржаўныя манаполіі... Абвесткі гэныя, ведама-ж, дужа добра аплачываюцца, і гэтак з скарбовае шкатулы перапала паном пэпэсам — „на добры сон“!—немалая сума грошы!

Мо' за такія „канцэсіі“ памякчэе пэпэсаўская апазыцыя?!

перашкаджаюць дзеючай асобе добра гуляць, сьцясьняючы твар у міміцы.

Пра парыкі многа гаварыць ня прыходзіцца, бо іх ужываюць у большасьці выпадкаў бяз зьмены іх віду і ў залежнасьці ад таго, калі валасы аматара не падыходзяць да варункаў, якія вымагаюцца п'есаю для дзеючай асобы.

Перад тым, як пачаць грыміраваць, трэба надзець парык, потым наклеіць бараду і вусы.

Перш-на-перш трэба ведаць аб тым, што ў мужчын заўсягды вусы бываюць сьвятлейшыя за бараду, а барада часьцей бывае з бакоў трошкі цямнейшая, чым пасярэдзіне. Колер барады і вусоў залежыць ад тыпу, ролю якога прыходзіцца гуляць.

Калі, напрыклад, наклейваецца барада, дык трэба на сампёрад прыгатаваць чатыры часьці яе:—першая наклейваецца на падбародак ад ніжняй губы, другая прыклейваецца пад падбародкам ад кадыка, а дзьве астатнія (вузкія і даўгія)—на шчоках. Трэба рабіць гэта так, каб усе чатыры часьці злучыліся разам; тагды па меры патрэбы падстрыгчы, або падцягнуць, расправіць—адным словам прыдаць ёй патрэбны выгляд. Вусы ўперад прыгатаўляюцца рукамі, даецца ім патрэбная форма і тагды прыклейваюцца. Велічыня, колер, форма і г. д. барады і вусаў залежыць ад ролі, а добрая работа яе залежыць ад уменьня грыміравальніка.

У меру вымаганьняў п'есы даюцца характэрныя рысы твару, робчы яго худым ці сытым; зьмяняюцца формы лобу, вачэй, носа, вуснаў і г. д., даючы ім патрэбны выгляд. Дзеля гэтага трэба ў адносных месцах накладаць цені і рабіць карпаціны. Калі, напрыклад трэба зрабіць гарбаты, або доўгі нос, тагды робяцца налепкі. У кароткіх славах, гэта вельмі трудна акрэсьліць, але-ж наагул у тых местах, дзе трэба зрабіць углыбленьні і западзіны—робяцца палосы цёмнымі колерамі, а выступы—зьлёгка сьветлымі. Накладаючы цені і рысы, трэба адшукваць паглыбленьні і выступы на сваім твары і, у залежнасьці ад патрэбы, ці паглыбляць іх, ці стушоўваць, каб іх ня было і г. д. Больш усяго гэта залежыць ад уменьня, здольнасьці таго, хто будзе грыміраваць.

Прывядзём яшчэ галоўнейшыя рысы твараў тых ці іншых выразных тыпаў.

У асоб з моцным, рашучым характарам, зьвярынага настрою—бровы зросшыя і нізка нахмураны, скулы на твары выдаюцца, вусны тонкія і моцна сьціснуты, падбародак выдаецца, між броваў і каля носа глыбокія рысы.

У асобы дуркаватай валасы стырчаць, шырокі твар, нізкі лоб, высокія дугою бровы, нос задзёрты, на лобе складкі, губы вялікія і адвіслыя, рот роскрыты і ўвесь твар выяўляе якоесь незразуменьне і зьдзіўленьне.

У вар'ята бровы высокія і трохі выгнутыя, вочы вялікія і круглыя (дзеля гэтага ніжнія і верхнія векі проціў бялкоў намалеўваюцца белым, а кругом абводзіцца чорным з такім вылічэньнем, каб вочы выглядалі вялікімі і шырока адчыненымі, вырачанымі). У весь твар выяўляе недаверра і падазронасьць.

У п'яніц вочы чырвоныя, нос чырвонафільлёвы, шчокі высока, каля самых вачэй і віскоў чырвона фільлёвыя, рот трохі перакрыўлены, вусны чырвона-карычневыя, у куточках з брудна-белым адценкам, увесь від растрэпаны.

Наагул высокі ясны і адкрыты лоб выражае сьветлы розум. Нізкі і зарослы лоб—тупы і непаваротлівы розум. Рыжыя барада і вусы ў людзеў хітрых і подлых.

У некаторых выпадках трэба грыміраваць рукі, шыю і грудзі (напрыклад у ролях хворых, або старыкоў), калі гэныя часьці цела бываюць аголеныя.

(Канец будзе).

Рэлігійны падзел урадоўцаў у Польшчы.

У дзяржаўных установах Польшчы працуе 133.313 мужчын і 49.847 жанчын.

Па рэлігійнай адзнацы яны дзеляцца так: Рымска-каталікоў—162.782; грэка-каталікоў—6.583; праваслаўных — 2.384; эвангэлістаў—3.142; іншых—4.897.

Такім чынам, у Польшчы, як старонцы з „каталіцкім духам“, ня гледзячы на тое, што некаталікоў ёсьць да 40 проц.,—яны складаюць толькі каля 10 проц. агульнай колькасьці ўрадоўцаў.

Сэрвітуты.

Ужо восем гадоў коцяцца з краю ў край нашай старонкі жальбы сялян на бясспраўнае адбіраньне панамі сэрвітутаў. Карыстаючы з прапажы падчас вайны многіх дакумэнтаў ды апіраючыся на свае ўплывы, паны самаўпраўна „пакасавалі“ належныя сялянам сэрвітутныя правы і ў многіх мясцох навет дабіліся таго, што сялян цяжка пазасуджвалі за нібы-то бяспраўную пашу і т. п. на панскай зямлі! Тыповай для ўсяе Заходняй Беларусі крыўдай можна лічыць нядаўную ліцытацыю васьмёх вёсак за карыстаньне сялянамі з належнай ім сэрвітутнай пашы ў Кобрыншчыне. Шмат у каго забралі там апошнюю кароўку.

Але-ж нажаль, трэба сцьвярдзіць, што бадай большая частка крыўдаў робіцца сялянам з прычыны цямноты, слабасьці, а часам і праданнасьці сялянскіх-жа прадстаўнікоў. Часта вясковыя паўнамоцнікі ня маюць адвагі цьвёрда супраціўіцца пану й земскаму камісару, калі той у панскі бок цягне, або гэта ўжо радзей, але таксама бывае! — проста прадаюцца пану за якую кудру, лепшую ніву ці пару вазоў сукоў. Гэткія паўнамоцнікі ўсё ўсюды падпісваюць, чаго толькі паны ня зажадаюць; вёсцы ня кажуць нічога казаць, або кормяць яе іжжой, ажно пакуль сяляне самі не агледзяцца, што за сэрвітутную пашу дасталі кусочак нікуды ня годнага балота, пяску, а то й нічога.

На слабасьць і нячэснасьць вясковых прадстаўнікоў няма іншага лякарства, як толькі выбіраць людзей цьвёрдых, шчырых і заўсёды дзяржаць іх пад кантролем: чэсных людзей кантроль ня ганьбіць, і яны яго не баяцца!.. Вясковыя прадстаўнікі мусяць на кожным агульным сабраньні здаваць вёсцы справаздачу з расходаваных грошаў. Калі маюць падпісаць які пратакол у пана ці ў камісара, дык мусяць перш гэты пратакол прачытаць на агульным сабраньні ў вёсцы і падпісаць толькі пасьля згоды большасьці сабраньня. Солтыс вёскі павінен захаваць сабе копію ўсякай вясковай пастановы, дадзенай паўнамоцнікам, і сачыць за яе выпаўненьнем. Ад прадстаўнікоў, каторыя спракудзяцца—(прап'юць вясковыя грошы ці ўвойдуць у хэўру з панам на шкоду вёскі),—трэ як найхутчэй адабраць усе паўнамоцтвы.

Вось лякарства на нясумленных.

На цемнату-ж вясковую ізноў-жа ёсьць адно толькі лякарства: здабываць сьвядомасьць, знаёміцца з усімі законамі і ўрадавымі пастановамі, якія ў дадзенай галіне існуюць. Цяпер, пад восень, калі свабаднейшыя ад працы ў полі, сяляне йзноў зарупяцца аб сэрвітутах, — пастараецца прысьці ім у помач і наша рэдакцыя. У гэтай стацьці даем толькі агульныя выясьненьні аб існуючых сэрвітутных законах, у наступных-жа нумарох нашай газэты будзем тлумачыць усе важнейшыя стацьці гэных законаў і выясьняць сялянам, як яны мусяць імі карыстацца.

У сэрвітутах, як і ў кожнай іншай галіне, закон больш бароніць інтарэсы паноў, як сялян. Калі-ж прыняць пад увагу багацьце і адукаванасьць пана, ягоныя шырокія „стасункі“ і г. п., — ды беднасьць і цемнату сялян, а яшчэ болей калатню паміж беднейшымі сялянамі і кулакамі, дык ясным стане, што, йдучы на ліквідацыю сэрвітутаў у сучасных варунках, сяляне рызыкуюць шмат чым, а пан—нічым.

Усе дасюляшнія сэрвітутныя правілы, як і ўсе панскія „зямельныя рэформы“, маюць на мэце перадусім тварэньне багатага вясковага кулака. Паны ня могуць ужо самы ўдзяржацца пры ўладзе, акружаныя морам сялянскай крыўды, дык пробуюць усялякімі падачкамі стварыць у кожнай вёсцы хоць пару паслухмяных сабе памоцнікаў — кулакоў. Дык для сялянскае бедноты яны пераважна некарысны. На ліквідацыі сэрвітутаў зарабляе заўсёды начыста пан і багацейшы гаспадар, а бядняцкія гаспадаркі трацяць свае права пашы заніштo.

Адсюль сяляне тых паветаў, гдзе абязуюць „крэсавыя“ законы, мусяць мець дзьве навукі—гэта:

1) Прыступаць да ліквідацыі сэрвітутаў толькі тады, калі гэта зусім ужо неабходна, гэта знача: калі пан зажадаў прымусовай ліквідацыі, калі хоча ў сялян зусім адабраць належны ім сэрвітут, або калі годзіцца дабравольна на выгадны для вёскі падзел сэрвітуту. Сама вёска мусіць жадаць ліквідацыі толькі тады, калі йдзе на хутары, або мусіць лішне часта за сэрвітут судзіцца.

2) Бедныя сяляне, якіх у кожнай вёсцы найболей, мусяць добра прыглядацца да ўсей ліквідацыі і дружна стаяць за падзел сэрвітутнай зямлі на лік цяперашніх гаспадарак (на нумары), а не даўнейшых (надзельных у часы скасаваньня прыгону). Бо на сэрвітут маюць усе цяперашнія гаспадары роўнае права, і падзел мусіць быць роўны, а не прапарцыянальны.

Янка Жыжмянскі.

Выбары у Самаурады.

Статыстыка выбараў у Віленска-Троцкім павеце.

„Kur. Wil." падае жменю цыфр аб ходзе выбараў у гмінныя рады віленска-троцкага пав., адбытых у маі і чэрвені с. г. Аказваецца, што ў сходах дзеля выбару сяброў гмінных сабраньняў прымало ўчасьце ад 20 да 30% насяленьня. Сярод выбраных радных 75% складаюць дробныя гаспадары з левай палітычнай ахварбоўкай. Каля 20% — прадстаўнікі сярэдніх і меншых зямяўласьнікаў памяркоўнага палітычнага кірунку. Каля 5%—прадстаўнікі абшарнікаў чыста правіцовага кірунку.

З агульнае лічбы 168 абраных радных 8 маюць вышэйшую асьвету, 6—сярэднюю, рэшта—ніжэйшую ці дамовую.

Выбары у Аддзел Сойміку.

(З Баранавіцкага пав.).

4 жніўня ў Баранавічах адбыліся выбары ў Аддзел павятовага Сойміку.

Дэлегатаў-сяброў Сойміку было 24, з якіх 2 прадстаўнікі ад баранавіцкага магістрату: багаты жыд і чыгуначны інжынэрпаляк, бо праваслаўная (беларуская?) фракцыя свайго прадстаўніка ў Соймік не правяла. Праваронілa! Дык гэтыя два голасы далі магчымасьць прайсьці ў Аддзел Сойміку тутэйшаму бурмістру Дембінскаму і ксяндзу Кавэцкаму. Іншых у лічбе 4-х выбралі беларусаў: Ф. Кандратчыка, Аўгена Міткевіча, Янку Павядайлу і Мароза. Значыць, большасьць беларуская! Гэтак-бы ўсюды!

А—т.

Выбары ў валасную раду.

(Пліская волясьць, Дзісеншчына).

25-га чэрвеня ў нас адбыліся выбары ў валасную раду. Сяляне пайшлі на выбары супольным фронтам па сьпіску № 1. Усяго было пададзена аж 12 сьпіскаў, з якіх адзін шаш, адзін жыдоўскі, а рэшта панска-асадніцкія.

Ня гледзячы на тае, што была наша сялянская большасьць, якая давала нам магчымасьць не правесьці ніводнага пана, усё-ж такі прайшло да рады двух паноў. Прайшлі яны сялянскімі галасамі, купленымі імі за гарэлку ды абяцанкі. Вельмі дрэнна, што сярод нас сяляи ёсьць такія яшчэ асобы, якія за прыгожыя словы паноў абшарнікаў, прадаюць інтарэсы сваіх братоў вяскоўцаў. Пара ўжо было-б прыйсьці да розуму, што лепшае жыцьцё пабудуем тольні мы самы і што інтарэсы вяскоўца бліжэй да селяніна, як да пана. Вынікі выбараў наступныя: беларусаў дзевяць, з якіх адзін іграе ў панскую дудку, двох паноў і адзін жыд.

Падслухаўшы.

ХРОНІКА.

Дэманстрацыя безработных. Стары эндэцкі магістрат м. Вільні перад сваей бясслаўнай сьмерцяй цяжка пакрыўдзіў частку безработных, нет ведама чаму пазбавіўшы іх права даставаць дарма абеды. З гэтай прычыны 5 жніўня больш за паўсотні пакрыўджаных безработных пайшлі грамадой у магістрат — прасіць новага прэзыдэнта аб скасаваньні загаду старога магістрату. Але-ж, замест выслухаць работнікаў, пан прэзыдэнт Фолеевскі і ягоны „віц"—пэпээсавец Чыж—паслалі перадусім па паліцыю і — пад яе ахранай — патрэбавалі, каб работнікі выбралі дэлегатаў дзеля гутаркі з новаабранымі гаспадарамі места. Гутарка, аднак, скончылася вельмі сумна для безработных: новы прэзыдэнт прызнаў пастанову эндэцкага магістрату правільнай...

Па мястовыя грошы. У Вільні істнуюць ажно два польскія сталыя тэатры, якія маюць на мэце „дэманстраваць" польшчыну места. Публікі ў іх бывае так мала, што яны саматугам—за свае даходы—жыць, ведама-ж, ня могуць. Вось іх усьцяж і пэдкармлівае ці то ўрад, ці то мястовы самаўрад, апанаваны палякамі. І не пасьпеў яшчэ новы самаўрад распачаць сваю працу, як першы выцягнуў руку сваю — па мястовыя грошы — польскі тэатр „Лютня". Просьба яго — скромная: толькі 10.000 злот., аднаразовае дапамогі і сталая штомесячная дапамога надалей, каб польскі тэатр у гэтым „искони польским" горадзе стаў гэтак „на крэпкіх фундамэнтах, дастойных мінуўшчыны і будучыны места Вільні".

Ну, на такіх „фундамэнтах" можна сьмела будаваць польскі тэатр хаця-бы.... у Гонолюлю!

Беспадстаўныя жальбы. Расейская газэта „За свободу". выдаваная ў Варшаве расейскімі эмігрантамі, страшэнна ўзлавана, што ў мястовай радзе сталіцы Зах. Беларусі, Вільні, засядае навет адзін беларус. І вось, каб падбурыць расейскія элемэнты проці нашага раднага Крука, „За свободу" друкуе паскудную, іхжывую карэспандэнцыю з Вільні з прычыны надрукаванае ў нас гутаркі з радным Круком. Нашаму радному закідаецца „крымінал": ён ні словам ня ўспомніў аб нацыянальных правох і інтарэсах расейскага насяленьня Вільні, хаця гэтае насяленьне нібы-то галасавала за грам. Крука ў часе выбараў!

Вось жа перадусім трэба сцьвярдзіць сьвядомую ілжу карэспандэнта „За свободу": расейская буржуазія галасавала на выбарах не за № 15, а аддала свае галасы за свайго сэн. Багдановіча—па сьпіску № 1. Гэтак сама злоснай брахнёй зьяўляецца заява карэспандэнта, быццам грам. Крук на перадвыбарных сходах прамаўляў парасейску і клікаў расейцаў галасаваць за „пятнастку": наш радны прамаўляў выключна пабеларуску і да беларусаў. Дык дзікім зьяўляецца дамаганьне расейскай эміграмцкай газэты, каб беларускі радны бараніў нацыянальныя інтарэсы расейцаў, якія маюць свайго ўласнага раднага—Багдановіча! І тым больш гэта дзіва, што расейскі радны сэн. Багдановіч на першым-жа паседжаньні новаабранае мястовае рады аб'явіў вайну беларусам, галасуючы за польскага кандыдата ў прэзыдэнты места і проці беларускага кандыдата!

Пэўне-ж ёсьць у Вільні і жменя работнікаў расейскае нацыянальнасьці. якія гуртуюцца каля работніцкіх партыяў і саюзаў, і яны ў кожнай патрэбе самі знойдуць дарогу да прадстаўнікоў працоўных у мястовай радзе, знойдуць і належную абарону сваіх сацыяльных патрэб і інтарэсаў. На гэта пасрэдніцтва расейскае буржуазнае газэты непатрэбна: „пятнастка" тут ніякай розьніцы між беларусамі, палякамі і расейцамі, ведама-ж, рабіць ня будзе.

Няпраўдай зьяўляецца і заява „За свободу, быццам радны Крук стаіць на чале радных „пятнасткі", зробленая з тэй мэтай, каб неяк абаснаваць усе вышэйпаданыя закіды па адрасу беларускага раднага. Ведама ўсім, што „пятнастка" складаецца з трох зусім самастойных групаў — беларусаў, незалежных сацыялістаў і лявіцы ППС, з якіх кожная адказвае за сябе (ня кажам аб тых партыях „пятнасткі", якія ў раду не прайшлі). Чаму-ж жалі сваі „За свободу" кіруе да раднага Крука, вымагаючы ад яго абароны расейскіх нацыянальных інтарэсаў?!

Расейскія манархісты працуюць далей. Расейскія манархісты, якія зьяўляюцца маральнымі вінавайцамі забойства радавага пасла Войкава ў Варшаве, карыстаюцца і далей з „традыцыйнага ліберялізму" польскага „дэмакратычнага" ўраду — дзеля разьвіцьця сваей нягоднай дзеяльнасьці ў Зах. Беларусі, пэўныя свае бяскарнасьці і нятыкальнасьці. За прысыланыя з Парыжу грошы манархістычныя агенты раскідаюць па краю дастаўляныя стуль-жа чорнасоценскія праклямацыі — асабліва ўздоўж радавае граніцы на польскім баку. Як падае „Słowo", надовячы зроблена гэта было ў ваколіцах Докшыц і ў самых Докшыцах. Сьледзтва ведама-ж, выкрыць вінавайцаў гэтак „пакульшто" ня здолела. Ну, пэўне-ж ніколі гэтага ня выкрые.

Афіцыяльны курс грошы на 9 жніўня Даляр—8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 60 гр.

9./VIII. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,90. Зал. р. 4,70. Чырв. 3 дал. 90 пен.

Карэспандэнцыі.

Устаньце, хлопцы, — стыдна спаць.

(Крывіцкае воласьці, Вялейскага павету).

Шмат ёсьць вёсак у крывіцкай воласьці, якія сьпяць моцным сном. Яны ня рупяцца ўстаць ад сну і пабачыць навакол сябе, што яны знаходзяцца ў цемры, як у тумане. У гэтых вёсках няма Гурткоў Т-ва Беларускае Школы. Гэтыя вёскі ня ладзяць спэктакляў, не адчыняюць бібліатэкаў-чытальняў, адным словам у гэтых вёсках цёмная, страшная ноч.

Устаньце, хлопцы,—стыдна спаць. Глянь це, што робіцца навакол Вас... Ужо шмат дзе кіпіць агонь культурна-асьветнае працы. Дык кіньце і вы хоць па аднаму паленку ў гэты агонь.

Хутчэй, Браты, да працы!

Бярыце прыклад з вёсак Каранішачы і Зарубельне. Яны арганізавалі Гурток Т-ва Беларускае Школы ў вёсцы Каранішачах і за кароткі час здолелі зладзіць тры спэктаклі ў Каранішачах і за даход ад гэтых спэкакляў адчыняюць цяпер бібліатэку-чытальню ў вёсцы Зарубельне.

Прачніцеся, хлопцы!!! Гаротнік.

Усюды ганяюць, усюды сьмяюцца.

(Гарадок, Маладэчанскі павет).

Той самы Кукелеўскі шляхцюк М. Шымкевіч, што прыстаў у прымы да абшарніцы двара Доўцевічы Барсуковай, які чуць не пастраляў сваіх дзяўчат за зьлізаную катом сьмятану, аб чым пісалася ў свой час у газэце „Наша Справа", ня спыняецца і далей выкідаць нумары шаленства. Шмат каму з суседзяў ужо прышлося бачыць пры грудзёх ці галаве яго браўнінг і выслухаць яго самыя любімыя слоўцы: „Бандыта, большэвік, камуністы і г. д.". На гэтых днёх давялося папасьціся пад яго запал жыхару вёскі Пажарышчы Кастусю Будрыку. 23 чэрвеня ў прысьвятак ён надумаў завезьці ў суседнюю вёску Тучына да стэльмаха дубу на восі і сьпіцы да калёс. Каб скараціць дарогу, павёз ён дуб новаю, пралажанаю ў часе вайны дарогаю. Перад дваром Доўцевічы быў саўсім разабраны мост, а бокам праехаць было нельга за балотам. Мусіў ехаць дворнаю дарогаю праз двор. Як толькі пад'ехаў бліжэй да палацаў паўпанка Шымкевіча, той падбег да яго, стрымаў каня і запытаў, адкуль, кудой і хто едзе. На адказ саўсім далікатны, паўпанак выхваціў з кішані браўнінг, абзываючы бандытам, большэвіком і камуністым, пагражаў застрэліць Будрыка за тое, што едзе праз яго двор. Калі-ж убачыў, што Будрык ня вельмі спалохаўся, ня кінуўся да рукі на калені, выняў нож і перарэзаў падпінак. Хацеў яшчэ перарэзаць гужы, але чамусьці стрымаўся. Ня йначай апомніўся і пусьціў ехаць. Будрык па дарозе з Тучына заехаў на пастэрунак у Гарадок і прасіў камандата напісаць пратакол на Шымкевіча. Камандат пратакол напісаў, але ці дасьць яму належны ход, не вядома, бо відочна цягнуў за Шымкевіча.

Тойсамы.

Да справы асушкі Палесься.

Мы ўжо падалі кароценькую вестачку аб палажэньні справы асушкі Заходняга Палесься. Цяпер падамо крыху больш інфармацыяў аб гэтай справе — нязвычайна важнай ня толькі для каланізацыйных плянаў Польшчы, але і для ўсяго гаспадарчага жыцьця Беларусі наагул.

Як ведама, на прапазіцыю Польшчы ў мінулае лета прыяжджала ад імя Лігі Нацыяў міжнародная экспэртная камісія, якая цікавілася двума справамі:

1) наладжаньня воднага шляху Чорнае-Балтыцкае мора,

2) асушэньня Палесься.

Праз Заходняе Палесьсе праходзяць два штучныя водныя шляхі, якія злучаюць Балтыцкае мора з Чорным: 1) Днепр—Прыпяць—Буг — Вісла з „Каралеўскім" каналам і 2) Днепр—Прыпяць—Шара—Нёман з каналам Агінскага. Абодва каналы ў часе імпэрыялістычнае вайны былі моцна зьнішчаны. Канал Агінскага гэтым летам ізноў адчынены дзеля руху, прычым кошт аднаўленьня дасягае некалькіх міліёнаў злотых. Але мізэрная глыбіня (1 мэтр) і невялікая шырыня моцна звужаюць яго значэньне і да злучэньня між морамі ў сучасным сэньсе ён нягодны тым больш, што канец шляху (ніжні Нёман) праходзіць праз Літву. Польскі ўрад і камісія заняліся другім шляхам — праз Каралеўскі канал у Віслу. Фінансавае абмяркаваньне выявіла значныя цяжкасьці, і практычнага ажыцьцяўленьня праекту пакуль што чакаць немагчыма.

Што датычыць другога пытаньня, дык увагі камісіі экспэртаў выданы Лігай Нацыяў асобнай кніжкай.

Гэта даволі вялікая брашура, у якой пасьля агульнага схарактэрызаваньня абшараў Польшчы, іх гідраграфічных і гэалёгічных асаблівасьцяў, экспэрты даюць аналіз прац польскага ўраду за часы Рэчыпаспалітае, потым прац расейскага ўраду. Далей экспэрты разглядаюць гаспадарчую, тэхнічную і фінансавую старану справы.

Па іх вестках Заходняе Палесьсе мае каля 6.000.000 гэктараў паверхні, у тым ліку 21 прац. няўдобіцы, 32 прац. балоцістых лясоў, 20 прац сенажацяў, таксама ў большай часьці балоцістых і няздатных дзеля жывёлагадоўляцае гаспадаркі. У працы камісіі экспэртаў прыводзяцца весткі з даваенных часоў аб выніках мэліярацыі ў некаторых маёнтках. Напр., у Лахве ў 1910 г. сабрана з гэктару па 10 квінталаў сена, пасьля асушэньня ў 1914-17 г. атрымана па 45 кв.

Таксама экспэрты прызнаюць, што, пасьля асушэньня, Заходняе Палесьсе магло-бы стаяць вялікім каляёнізацыйным фондам, спасобным разьмясьціць на сабе зьлішкі насельнасьці з іншых мейсц Польшчы.

Пасьля падрабязнага пробнага падрахунку коштаў, экспэрты называюць суму 450 міліён. зл. Затрата гэтай сумы апраўдаецца асушэньнем каля 1.500.000 гэктараў палескіх балотаў, біручы пад увагу, што палеская сенажаць перад асушэньнем дае 10-20 квінталаў сена па 3-4 зл. за кв., а на асушаных абшарах пад Сарнамі атрымана на 50-60 кв. сена па 10 зл. за квінтал. Сярэдні кошт неасушанае зямлі прыймаецца за 100 зл., асушанае—за 400 зл.

У канцы экспэрты выказваюць думку, што рэнтоўнасьць справы не падлягае сумляваньню і што замежны капітал можа ёю зацікавіцца.

Трэба тутака адзначыць, што Палесьсе падзелена рыжскім трактатам на дзьве паловы: Заходняя належыць да Польшчы, Усходняя—да Радавае Беларусі. Вось-жа справа асушкі Палесься ня можа быць разьвязана аднабока—толькі на адной з гэтых частак, а мусіць абняць усю Беларусь уцэласьці. І вось, як мы даведываемся, на Усходзе зацікаўленасьць справай Палесься— дужа вялікая: тамака яна прызнана важнай ня толькі для Беларусі, але і для ўсяго Радавага Саюзу — з таго пагляду, што, калі-б Палесьсе было асушана і абшар годнае да гаспадаркі ральлі павялічыўся-бы—дык ня трэба было бы лішку насяленьня Беларусі, якому цяпер домацесна, слаць некуды ў Сібір, ды затрачываць на гэта вялікія грошы. Беларуская прэса ў Радавай Беларусі горача займаецца справай асушкі Палесься; у „Савецкай Беларусі" зьмешчаны цэлы рад стацей, пасьвячоных гэтаму пытаньню, а Усесаюзны Цэнтральны Выканаўчы Камітэт вынес пастанову, што мэліярацыйныя працы на Палесьсі прызнаюцца працамі агульна саюзнага значэньня.

Цікава, якая-ж частка Палесься прыжджэ асушкі раней: Заходняя, якую Польшча—пры дапамозе замежнага капіталу—маніцца выкарыстаць перадусім дзеля сваей каляніізацыйнай палітыкі, ці Усходняя, якая мусіць спадзявацца галоўным чынам на свае ўласныя сілы?

З Радавае Беларусі.

Пасылка хадакоў.

За апошні справаздачны час (6 тыдняў) з БСРР выехала 852 хадакоў ад 28,138 ч. Найбольш хадакоў з Барысаўскай, Віцебскай і Гомельскай акругаў.

Большасьць хадакоў накіравалася ў Сібір (705 чал.), на Урал (63 чал.) і на Далёкі Усход (84 чал.).

Для Беларусі адпушчана зямлі: ў Сібіры 19.000 душавых доляў, на Урале — 5.500 і на Далёкім Усходзе—3.493.

Усе зямельныя фонды, адпушчаныя для БССР у Сібіры і на Далёкім Усходзе. ужо разьмяркаваны. Засталіся вольныя вучасткі толькі на Урале (60 прац.).

Арганізацыя рабфаку ў Гомелі.

У Гомелі мяркуецца арганізаваць рабочы факультэт з 4-гадовым курсам навучаньня. Рабфак разьлічаны на 80 чал. і будзе знаходзіцца ў памешканьні замку. Апрача таго, мяркуецца адчыніць рабфак для с.-г. рабочых у Васілевічах у памяшчэньні былога лясного тэхнікуму.

Беларускае школьніцтва ў Смаленшчыне.

Сетка беларускіх школ І ступені ў Смаленшчыне павялічваецца ў 27-28 нав. г. на 100 прац. Для гэтых школ патрэбна падрыхтаваць настаўнікаў, і Смаленскі губ АНА супольна з НКА РСФР адпусьцілі сродкі на перападрыхтоўку. З 25 ліпня г. г. арганізаваны курсы па перападрыхтоўцы беларускага і жыдоўскага настаўніцтва.

Белеруская старонка ў цэнтральных газэтах.

Накатарыя цэнтральныя газэты Саюзу пачынаюць выпускаць беларускія старонкі, на якіх высьвятляецца жыцьцё членаў саюзаў беларусаў. Да гэтага часу пачала выпускаць дадаткі на беларускай мове — газэта „Гудок" саюзу чыгуншчыкаў. Мяркуе выдаваць беларускую старонку і „Учыцельская газэта".

Беларуская кіно-фабрыка.

Да апошняга часу „Белдзяржкіно" ня мела сваей уласнай кіно-фабрыкі. Усю вытворчую працу прыходзілася праводзіць на чужых кіно фабрыках. Павільёныя здымкі „Ляснойй Былі", напрыклад, рабіліcь ў Маскве, „Гірш Лекерт" здымаўся на Ленінградзкай ф-цы „Совкино", пры чым здымаўся ў надзвычайна цяжкіх умовах—ноччу.

Усё гэта прымусіла ўзьняць пытаньне аб пабудове ўласнай кіно-фабрыкі.

Зараз у Эканамічнай Нарадзе разглядаецца пытаньне аб пабудове кіно фабрыкі ў Менску. Белдзяржкіно просіць на гэту справу доўга-тэрміновы крэдыт у 360.000 р.

Гэта фабрыка мае быць пабудована ў Менску.

Апрача гэтага, Белдзяржкіно ўжо зараз распачало працу па арганізацыі сваей уласнай кіно-фабрыкі ў Ленінградзе.

Ленінградзкі Губэрскі Вык. Камітэт адпусьціў пад гэту кіно-фабрыку вялікі 4-ох павярховы будынак. Будынак няжылы, патрабуе вялікага рамонту. Гэты рамонт ужо распачаўся. Капітальны рамонт будынку, — арганізацыя асьвятленьня, установка трансфарматараў у ім, усё гэта будзе каштаваць 57.000 рублёў.

Для ф-кі заказана розная апаратура ў Адэсе, і некаторая замежная кіно-апаратура—заказана ў Бэрліне.

Новая вялікая кіно-ф-ка „Белдзяржкіно" ўжо ў лістападзе распачне сваю працу. На ўласнай кіно-фабрыцы будзе засьнята новая карціна з жыцьця жыдоў на Беларусі—„Карчма" па сцэнарыю Аршанскага і М. Чарота.

У будучым годзе на гэтай ф-цы „Белдзяржкіно" мяркуе зрабіць 6 новых вялікіх мастацкіх карцін, у большасьці з беларускага жыцьця.

Па сваіх разьмерах, па свайму абсталяваньню ф-ка „Белдзяржкіно" будзе раўняцца лепшым сучасным кіно-фабрыкам СССР.

Усячына.

— У амэрыканскай арміі ўводзяцца новыя магутныя аэрапляны дзеля бамбардыроўкі крэпасьцяў і суднаў. Аэрапляны будуць мець па 2 маторы ў 950 сіл кожны. Грузапад'ёмнасьць іх—500 пудоў бомбаў.

— У Амэрыцы ўстаноўлена прэмія 200.000 рублёў за пералёт бяз спуску праз Атлянтычны акіян з Нью-Ёрку ў Рым (Італія).

— Вядомая ангельская газэта „Дэйлі-Кронікль" і рад іншых буйных ангельскіх ліберальных газэт куплены нова-складзеным акцыянэрным таварыствам з капіталам у 30 міліёнаў рублёў.

— Клімат у Гішпаніі рэзка зьмяніўся. У той час, як ліпень у Гішпаніі вызначаецца трапічнай гарачынёй, цяпер там пашоў сьнег і пачаліся марозы. У горах знойдзены зьмерзшыя авечкі з пастухом.

— Тэа Раш, нямецкая жанчына-авіятар, зьбіраецца ў самым бліжэйшым часе зрабіць палёт з Амэрыкі ў Нямеччыну.

— У Амэрыцы будуецца самы большы ў сьвеце акіянскі параход, вадазьмяшчэньнем у 50.000 тон. Параход разьлічаны на 4.200 пасажыраў, ня лічачы каманды.

— У Нарвэгіі зроблены досьледы, які дом самы эканомны ў сэньсе апалу. На першым месцы аказаўся драўляны дом са сьценамі, запоўненымі пілавінамі.

Рэдактар-Выдавец: П. Кумпяк.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.